## ЗАЯВА ЦК БСДП АБ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) выказвае крайнюю заклапочанасць у сувязі з пачаткам чарговага перыяду зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

Падобныя тэндэнцыі ў эканоміцы, якія прыводзілі да пагаршэння якасці жыцця грамадзян нашай краіны, назіраліся ў 2008-2009 і 2011 гадах. Улада чарговы раз не зрабіла ніякіх высноў з крызісаў нядаўніх гадоў.

Прынятая Нацыянальным банкам пастанова аб увядзенні 30-працэнтнага збору пры куплі валюты не вырашае сітуацыю ў цэлым, а, наадварот, зацягвае працэс стагнацыі ў эканоміцы і сацыяльнай сферы. Найбольш уразлівым ў дадзеным рашэнні з'яўляецца просты грамадзянін Беларусі.

На наш погляд, прадпрынятая мера толькі пагоршыць сітуацыю як у рэальным сектары эканоміцы, так і ў сацыяльна-грамадскіх адносінах паміж грамадзянамі і дзяржавай.

Як паказвае практыка, падобныя меры прыводзяць да фарміравання ценявой эканомікі, а значыць да памяншэння падаткавых выплат і, як наступства, да скарачэння паступленняў у бюджэт. Акрамя таго, рашэнне Нацыянальнага банка правакуе як фізічных, так і юрыдычных асоб на ажыццяўленне незаконных дзеянняў па валютных аперацыях.

Мы, сацыял-дэмакраты, лічым, што гэта рашэнне ўшчамляе законныя правы і інтарэсы грамадзян нашай краіны. Ніякія адміністрацыйныя і сілавыя меры ў дадзеным выпадку не прывядуць да паляпшэння сітуацыі на фінансавым рынку.

Для кантрольных органаў зноў крайнім апынецца просты грамадзянін нашай краіны, які ў сілу эканоміі сродкаў і невысокага ўзроўню даходу будзе пакараны за дзеянні, якія яшчэ ўчора былі легальнымі. На наш погляд, гэта несправядліва і амаральна.

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) – партыя справядлівасці і раўнапраўя, партыя будучыні, партыя большасці грамадзян, якія хочуць пераменаў.

Мы заклікаем Урад прыступіць да сістэмных рэформаў у палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах, накіраваных на абарону законных правоў і інтарэсаў грамадзян нашай краіны, забеспячэнне ўстойлівага развіцця, умацаванне дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці Беларусі.

Далучайцеся да Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады)! За лепшую Беларусь!

21 снежня 2014 г.
г. Мінск.

## БЕЛОРУССКИЕ ЛЕВЫЕ ПРИНЯЛИ ЕДИНУЮ ПЛАТФОРМУ НА БЛИЖАЙШИЕ ПЯТЬ ЛЕТ

(ПРОДОЛЖЕНИЕ СТР.1)

Генпрокуратура должна осуществлять надзор за неукоснительным соблюдением законов в стране.

В финансово-экономической сфере, по мнению левых, необходимо обеспечить рост ВВП в 1,4 раза; достигнуть темпов роста производительности труда в целом по экономике не ниже 8%; ввести прогрессивную шкалу подоходного налога и налога на роскошь; оптимизировать государственные расходы, в том числе — существенно снизить расходы на содержание бюрократического аппарата.

В области денежных доходов населения левые считают необходимым обеспечить повышение уровня реальных доходов населения минимум в 1,4 раза; пересмотреть структуру минимального потребительского бюджета; увеличить размер минимальной заработной платы до величины, равной минимальному потребительскому бюджету; довести среднюю зарплату до уровня не ниже 3,5 минимального потребительского бюджета.

Принятая платформа также содержит изменения, которые представители левых сил предлагают внести в сферу трудовых отношений, образования, здравоохранения, ЖКХ, системы пенсионного обеспечения и социальной защиты населения.

В области внешней политики левые настаивают на укреплении «суверенитета и национальной безопасности Республики Беларусь, осуществлении миролюбивой и дружественной внешней политики, а также на восстановлении в полном объеме нормальных отношений с зарубежными странами и межгосударственными структурами».

Напомним, участниками форума «За социальный прогресс» стали около 100 активистов Белорусской партии левых «Справедливый мир», Белорусской социал-демократической партии (Грамада), Белорусской партии «Зеленые», а также оргкомитетов по созданию Партии трудящихся и женской партии «Надзея».

## ПРАЙШЛО ПАСЯДЖЭННЕ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ

**10 снежня прайшло пасяджэнне Віцебскага абласнога камітэта партыі, удзельнікі якога вызначылі дату правядзення чарговай абласной справаздачна-выбарнай канферэнцыі.**

У адпаведнасці за зменамі ў Статуце партыі, абмеркаваны ўдзел у выбарах новага кіраўніцтва абласной партыйнай арганізацыі сябраў партыі, якія пражываюць у розных гарадах Беларусі, дзе БСДП не змагла атрымаць афіцыйнай рэгістрацыі сваіх структур.

Разгледжана пытанне аб партыйных складках.Удзел у пасяджэнні прымалі таксама сябры партыі з Віцебску, Полацка і Наваполацка, Верхнядзвінска.

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ
Галоўны рэдактар - Вітольд Няўрыда
Надрукавана на ксераксе. Наклад 299 ас.
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада)
224030 г. Брэст, вуліца 17 Верасня, д.22-23
Тэл./факс +375 162 22 06 03

# САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ

БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ • ГРАМАДА •
СВАБОДА! СПРАВЯДЛІВАСЦЬ! САЛІДАРНАСЦЬ!

Бюлетэнь БСДП, Магілёў, №13, снежань 2014г

## АДЗІНАГА КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ МОГУЦЬ АБРАЦЬ НА КАНГРЭСЕ

**Апазіцыянеры заявілі, што адбудзецца гэта толькі ў канцы сакавіка 2015-га.**



Пагадненне аб працэдуры вылучэння адзінага кандыдата ў прэзідэнты на выбарах 2015 года 17 лістапада падпісалі пяць апазіцыйных партый і арганізацый. Гэта — Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), Рух «За Свабоду», кампанія «Гавары праўду», Партыя БНФ, аргкамітэт па стварэнню партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя». Пра гэта было абвешчана на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Як мяркуецца, падрыхтоўка да кангрэса дэмакратычных сіл пачнецца яшчэ сёлета. Калі ў бліжэйшы час да падпісантаў далучацца АГП ці «Справядлівы свет», адзінага кандыдата выбяруць на кангрэсе ў канцы сакавіка 2015-га. Інакш яго плануюць прыблізна на травень 2015 года.

Андрэй Дзмітрыеў, які прадстаўляе «Гавары праўду», на прэс-канферэнцыі адзначыў, што ёсць два сцэнары: альбо кангрэс і адзіны кандыдат, альбо байкот выбараў.

## БЕЛОРУССКИЕ ЛЕВЫЕ ПРИНЯЛИ ЕДИНУЮ ПЛАТФОРМУ НА БЛИЖАЙШИЕ ПЯТЬ ЛЕТ

**Платформу «демократического правового социально ориентированного государства с эффективной экономикой» приняли на форуме «За социальный прогресс» 16 ноября в Минске.**



Называя себя «сторонниками идеи социальной демократии», участники форума выступают «за новый курс устойчивого социального развития и прогресса». По их мнению, развитие Беларуси должно быть направлено на «создание основ демократического правового социально ориентированного государства с эффективной экономикой, в котором всем гражданам будут обеспечены равенство стартовых возможностей, гарантии соблюдения прав личности, экономическая и экологическая безопасность».

В платформе определены важнейшие политические и социально-экономические задачи, которые необходимо решить до 2020 года. В политической сфере это — проведение свободных и справедливых выборов в парламент, введение смешанной пропорционально-мажоритарной системы выборов, переход к однопалатному парламенту с депутатами, работающими на профессиональной основе. Для осуществления таких реформ белорусские левые считают необходимым созыв конституционного собрания.

Они также считают, что следует увеличить полномочия Конституционного суда и следовать нормам общеевропейской Хартии самоуправления.

**Продолжение на стр.4**

## У БРЭСЦЕ ПРАЙШОЎ АДЗІНЫ ДАЗВОЛЕНЫ Ў БЕЛАРУСІ ПІКЕТ ДА ДНЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Адбыўся ён у мясцовым парку воінаў-інтэрнацыяналістаў.**

У Брэсце прайшоў адзіны дазволены ў Беларусі пікет да Дня правоў чалавека. Мерапрыемства было прымеркаванае да 66-й гадавіны прыняцця Дэкларацыі правоў чалавека. Са словаў удзельнікаў пікету, яго галоўная мэта — прыцягуць увагу брэстаўчан да наяўнасці палітзняволеных у краіне. Праўда, саміх брэстаўчан у будні дзень у парку апынулася няшмат. Пераважна гэта былі пары з калыскамі ды пенсіянеры.

«Гэта лепей, чым другое месца, дзе дазволена праводзіць мерапрыемствы, — стадыён «Лакаматыў». Тут хоць ходзяць людзі ходзяць і звяртаюць на нас увагу. Гэта добра. Дзякуй богу, што апошнім часам мясцовыя ўлады дазваляюць праводзіць мерапрыемствы», — распавядае Еўрарадыё адзін з удзельнікаў акцыі праваабаронца Уладзімір Малей.

Хоць пікетоўцаў было няшмат, збоку за імі пільна назіралі супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным.

Дарэчы, брэсцкія ўлады ўжо другі год запар дазваляюць падобную акцыю. Раней чыноўнікі з розных прычынаў забаранялі праводзіць праваабарончыя пікеты нават у дазволеных для гэтага месцах.



## В РЕЧИЦЕ АКТИВИСТЫ И ПРАВОЗАЩИТНИКИ ОТМЕТИЛИ ДЕНЬ 10 ДЕКАБРЯ

**Всеобщая декларация прав человека провозглашает права личности, гражданские и политические права и свободы (равенство всех перед законом, право каждого на свободу и личную неприкосновенность, свободу совести и другие).**

Она была принята 10 декабря 1948 года Генеральной Ассамблеей ООН. А спустя два года этот день был провозглашен как День прав человека. Декларация стала первым универсальным документом по правам человека. Многие страны включают основные ее положения в свое базовое законодательство и конституции. Ее принципы лежат в основе многих пактов, конвенций и договоров по правам человека, заключенных с 1948 года. Этот документ был переведен на множество языков мира (более 350 в 2009 году). Элеонора Рузвельт назвала Декларацию «Великой хартией вольностей» для всего человечества (поэтому Декларацию иногда называют Хартией прав человека).

Именно поэтому, гражданские активисты и правозащитники Речицы собрались сегодня вместе, чтобы обсудить положение прав человека в Беларуси. Со вступительной речью выступил Валерий Путицкий. Затем слово взял член Президиума БСДП от Гомельской области Олег Шабетник. После выступлений все собравшиеся просмотрели фильмы по правозащитной тематике.





## ІГАР БАРЫСАЎ: «ШКОЛА І САДОК НА ЗЛАТАВУСТОЎСКАГА - ГЭТА СТРАТЭГІЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ, ЯКІЯ НЕАБХОДНЫ РАЁНУ»

**Намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) Ігар Барысаў лічыць, што сацыяльныя аб'екты ў Магілёве не паспяваюць за ростам дамоў у новых мікрараёнах.**



- Дамоў на вул. Златавустоўскага і вул. Цярохіна набудавалі шмат, аднак ні школы ні садка не пабудавалі дагэтуль. Жыхарам новага раёна прыходзіцца траціць процьму часу, каб завадзіць дзяцей у іншыя садочкі і школы, якія раскіданы ў межах усяго горада. Гэта нязручна і адымае шмат часу, - кажа сацыял-дэмакрат.

Каб вырашыць пытанне з мёртвай кропкі быў утвораны аргкамітэт з ліку мясцовых жыхароў раёна, які распачаў збор подпісаў за будаўніцтва садка і школы.

- Гэта першы збор подпісаў пад нашай ініцыятывай на новым раёне. Паводле нашай ацэнкі ў цэнтры двара, які ахоплівае больш за 20 дамоў, мусяць як раз такі і размяшчацца гэтыя сацыяльныя аб'екты, але іх няма, хоць некаторыя дамы ўжо зданы ў эксплуатацыю некалькі год назад. У цэнтры двара - пустыр. Хацелася, каб там былі школа і сад, а не хмарачосы і гандлёвыя цэнтры, - кажа Ігар Барысаў.

Намеснік старшыні БСДП лічыць, што калі ўлада зацікаўлена ў тым, каб гараджане давалі станоўчы прырост насельніцтва - трэба ствараць адпаведную інфраструктуру.

- Маладых сем'яў на раёне шмат. Некаторыя з іх думаюць пра другога і трэцяга дзіця. Калі ж не будзе інфраструктуры і трэць дні будзе займаць працэс адвозу і забірання дзіця з садка, то не кожны з маладых бацькоў адважыцца на павелічэнне сваіх сем'яў. Горад павінен быць для грамадзянаў і мусіць быць зручным, а чыноўнікі мусяць ствараць для гэтага усе ўмовы , - гаворыць Ігар Барысаў.

Трэба адзначыць, што ініцыятарамі кампаніі «Утульны горад» сталі Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), аргкамітэт па стварэнні партыі Беларуская Хрысціянская дэмакратыя, а таксама грамадзянская ініцыятыва «Грамадскі магістрат». У межах кампаніі плануецца актывызаваць вырашэнне пытанняў у не менш чым 200 праблемных магілёўскіх дварах.

## У ГАРОДНІ РАЗВІТАЛІСЯ З ВАЛЕРЫЕМ ФРАЛОВЫМ

**12 лістапада намесніка старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) Валерыя Фралова пахавалі на гарадзенскіх могілках, што на праспекце Касманаўтаў.**



Шмат людзей правяло генерала ў апошні шлях. На пахаванні прысутнічалі аднапартыйцы, былыя калегі па войску, а таксама вайсковы аркестр.

Кажа кіраўнік Гарадзенскай абласной партыйнай арганізацыі БСДП (Грамады) Алег Рамашкевіч:

- Фралоў Валерый Дзмітрыевіч быў сябрам нашай партыі БСДП (Грамады), гэта быў вельмі вялікі набытак, такога сябра мець, гэта быў вялікі гонар для нас. Калі не браць пад увагу ўсе яго заслугі, усе яго магчымасці, яго характар, тое што ён проста быў у нас, гэта многа значыла. У яго быў вялікі досвед працы з людзьмі, ён вельмі разбіраўся ў людзях, ён цаніў людзей, ён са сваім генеральскім імпэтам часта проста нас адзёргваў, ставіў на месца, калі мы штосьці не так казалі, не так рабілі, ці не туды рухаліся.

Удзельнікі пахавання згадалі таксама арганізацыйныя якасці генерала Валерыя Фралова і яго прынцыповы характар.

Валеры Фралоў нарадзіўся 14 жніўня 1947 г. у Менску. Скончыў Менскі аўтамеханічны тэхнікум, Харкаўскае гвардзейскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча, Ваенную акадэмію бранятанкавых войскаў, Акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Генерал-маёр.

У 2000–2004 гг. дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Камісіі па нацыянальнай бяспецы, узначальваў апазіцыйную групу «Рэспубліка».

У БСДП уступіў у 2004 г. У 2006–2009 гг. быў старшынёй Менскай гарадской арганізацыі БСДП. У сакавіку 2007 – кастрычніку 2010 г. і з 5 чэрвеня 2011 г. намеснік старшыні БСДП.

Жанаты, трое дзяцей.Узнагароджаны ордэнамі "За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР" III ступені, Прападобнага Сергія Раданежскага і 11 медалямі.